## Экскурсія “Сімволіка і абрадавае выкарыстанне ручніка ў вёсцы Імянін Кобрынскага раёна”

Адным з найбольш цікавых феноменаў традыцыйнай беларускай культуры з’яўляецца ручнік, які адносіцца да тых прадметаў народнага мастацтва, што належаць і мінуламу, і сучаснасці. Папулярнасць яго нязменная, гэта адвечны спадарожнік чалавека. Ручнік цесна звязаны з жыццём чалавека ад моманту яго нараджэння і да моманту пераходу ў іншае пасля смерці жыццё, а таксама з ранку і да вечара штодзень. Ручнік— спадарожнік чалавека не толькі ў важных святочных падзеях, але і ў штодзённых жыццёвых турботах.

Менавіта ручнік з найбольшай яркасцю увасабляе высокае мастэрства ткацтва, вышыўкі і вязання, таму тэма нашай экскурсіі-- “Сімволіка і абрадавае выкарыстанзнаёмства з часам, спосабам вырабу, кампазіцыяй ручніка, з сферай выкарыстання, сімволікай арнаменту, а таксама з выкарыстаннем ручніка на сённяшні дзень ў абрадах маёй роднай вёскі Імянін Кобрынскага раёна.

Ткаць ручнік дазвалялася толькі ў пост, калі цела ачышчалася ад бруду, думкі напаўняліся дабром, паводзіны характарызаваліся стрыманасцю і пачцівасцю, а душа асвятлялася жыццестваральнай энергіяй.

Па розных этнаграфічных крыніцах дзяўчына пачынала рыхтавацца да замужжа з дванаццацігадовага ўзросту і павінна была сваімі рукамі выткаць ад 25 да 40 ручнікоў, якія потым шырока выкарыстоўваліся ў многіх рытуальных сітуацыях.

Рушнікі ткалі на кроснах. Ніткі пралі з кудзелі льну на пралках, наматвалі на верацяно, а з верацяна – на цэўку (палачку з маліны), якая ўстаўлялася ў чаўнок. Жанчына садзілася за кросны, і чаўнок у яе руках хадзіў туды-сюды па нацягнутых нітках станка. Палатно атрымоўвалася шэрае, трэба было яго адбяліць попелам у бочцы без дна, куды залівалася гарачая вада і перасыпалася ўсё попелам, пасля адмакала нейкі час. Затым

жанчыны вынімалі палатно, паласкалі, рассцілалі на траве, і сонца высушвала і дабельвала тканіну, якая была вельмі здаровая і прыемная да цела.

У традыцыйнай  культуры белы колер сімвалізаваў "пераход" з аднаго стану ў другі. Чырвоны – наадварот, адпавядаў стабільнасці, спакою.

Кампазіцыя арнаменту на абодвух канцах падобная, але перавернутая, як у люстэрку.

Усходнія славяне раздзялялі гэты цудоўны твор чалавечых рук на некалькі  тыпаў, кожны з якіх меў сваю сферу выкарыстання. Самым простым па вырабе лічыўся ручнік-"уціральнік", якім у паўсядзённым жыцці выціралі рукі і твар. Як правіла, ён не меў арнаментальнага ўпрыгожання і быў шэрага колеру.

Насупраць, самым высокім статутам надзяляўся ручнік-"набожнік", якім упрыгожвалі чырвоны кут хаты.

Яшчэ адным відам ручнікоў была "намітка" – своеасаблівы галаўны ўбор беларускіх жанчын.

Першы "кантакт" нованароджанага адбываўся менавіта з шэрым (белым, адбеленым) ручніком. Бабка-павітуха клала немаўля ў гэтую цёплую і мяккую лодку-калыску і несла да ночваў, каб змыць сляды на "тым" свеце і пераходу ў гэты. Пасля першага купання яна спавівала дзіця ў белую пялёнку, а затым перавязвала тонка браным ручніком (спецыяльна перадаваўся ад пакалення да пакалення і зноў-такі выконваў ролю паяднання сям'і і дзетак, абярэгу ад варожых сіл).

Пад час хрышчэння немаўлятка тройчы апускалася ў святую ваду і ўкрывалі, выціралі ручніком, які дарыла хросная.

Калі сям'я спраўляла "ўлазіны" ці "наваселле", то бацька па чарзе перавязваў рукі ўсім дамачадцам ручніком і ўводзіў-уцягваў у новую хату.

Чарговым адказным этапам у жыцці чалавека (калі мець на ўвазе шлях ад нараджэння да смерці) было вяселле.

Падчас сватання бацькі ў знак згоды на шлюб абменьваліся хлебам, агорнутым ручніком.

Важна адзначыць і такую рэч, як паяснное (вакол жывата) абвязванне ручніка. Дачка абвязана белай часткай ручніка-- яна “памірае” ў статусе дачкі для гэтай сям’і і народзіцца ў статусе гаспадыні ў іншай, новастворанай. Бацька свайго статусу не мяняе, таму трымаецца за чырвонае, вышытае, што сімвалізуе жыццё.

Перад тым, як адправіць маладых з хаты да храма, каля парога хаты або печы бацькі нявесты станавіліся ўдваіх, кожны з іх браў па бохану хлеба і загортваў яго ў чырвоныя канцы ручніка. Адной рукой яны трымалі хлеб, а другой уздымалі як мага вышэй белую сярэдзіну ручніка. Утваралася арка, праз якую дачка-нявеста і будучы зяць  адпраўляліся ў новае жыццё.

Ручнік у дадзеным выпадку сімвалізаваў толькі тое, што да вянца ехалі два (да гэтага часу паасобныя) маладыя жыцці. У храме іх паяднаюць, павяжуць, абвянчаюць, звядуць у адзінае цэлае, таму маці і сустракала маладых пасля вянца ўжо толькі адным боханам хлеба на ручніку.

Мужчына з боку жаніха, які “вёў” вяселле і наглядаў за ходам мерапрыемства, упрыгожваўся крыж-накрыж ручнікамі, каб усе бачылі і заўважалі свата, а руках быў бохан хлеба, агорнутага, канечне, у гэты прадмет.

Сведкі жаніха і нявесты таксама ўпрыгожваліся ручніком, зараз гэтую ролю выконваюць стужкі.

Самы яскравы прыклад: падчас вянчання ў храме маладыя стаялі поруч на белай частцы чырвона-бела-чырвонага ручніка (гэты рытуал перайшоў і на грамадзянскую рэгістрацыю шлюбу). Сёння выкарыстоўваюцца як новыя, з крамы, так і вышытыя, як зварот да мінулага.

Сведкі шлюбавін клалі пад яго грошы, каб жаніх і нявеста былі багатымі. Маладая падчас абыходу царквы павінна была зачапіць абцасам і пацягнуць за сабой ручнік, каб незамужнія сяброўкі хутка павыходзілі замуж. Таксама бацюшка рукі маладых звязвае гэтым прадметам, нібы яднае ў цэлае, у сям’ю.

Пасля таго як жаніх і нявеста ўваходзілі ў хату, яны па сонцы (злева на права) ішлі за вясельны стол у чырвоны кут хаты і садзіліся пад абразамі. Ікона-- сімвал вечнасці-- абавязкова пакрыта ручніком, аздабленне якога мае тую ж трохчасткавую кампазіцыю. Засяроджу увагу: сімвал вечнасці-- ікона пакрыта белым полем, ніжэй звісаюць палаючыя чырвоныя канцы, з вышытым малюнкам-арнаментам. Тая ж “трыумфальная арка вечнасці” (падкова шчасця) звязала маладых, якім доўжыць справу бацькоў у гэтай хаце.

Важнае і пачэснае месца на вяселлі займаў каравай, які выносіўся нежанатым братам на вышытым ручніку, сёння гэтую функцыю выконваюць сурвэткі.

Нявеста абавязкова адорвала на вяселлі радню жаніха ручнікамі, якія самастойна саткала і аздобіла.

Жаніх браў маладую на рукі і пераносіў праз парог. Але перад гэтым яго бабуля праз той самы парог павінна была палажыць чырвона-белы-чырвоны ручнік такім чынам, каб чырвоныя канцы былі перад і за парогам, а белая частка ляжала непасрэдна над парогам, дзе па ўяўленням беларусаў жылі нашы продкі. Зараз гэтая трацыя перайшла таксама на грамадзянскую рэгістрацыю шлюбу.

Наступны рытуал, які суправаджаўся ручніком, пахаванне.

Дом, дзе толькі што памёр чалавек, пазначаўся ручніком, які вывешваўся на акно. У хаце абачлівыя гаспадыні занавешвалі белым покрывам усё тое, што можа адлюстроўваць, даваць адбітак, “паказваць выяву смерці”, таму сёння занавешваюць камп’ютары, тэлевізары, люстэркі.

У даволі адказны час пераходу з аднаго свету ў іншы, лодка-труна (дамавіна) і сам нябожчык былі ўпрыгожаны белым покрывам. Звычайна дно труны, яго абодва бакі абабіваліся трыма белымі ручнікамі, а самога нябожчыка ад ног і да пояса закрывалі яшчэ адным белым ручніком. Сёння замест яго выкарыстоўваецца белая мануфактурная тканіна тонкага вырабу.

Труну з нябожчыкам апускалі ў магілу на спецыяльных чырвона-бела-чырвоных ручніках. Замест іх магло быць і звычайнае даўжэзнае палатно, якога хапала, каб двойчы прапусціць пад труной. У апошнім выпадку канцы сувоя вылучаліся больш густой шэрай таніроўкай. Трымаліся заўсёды за чырвоную (вышытую) частку, што сімвалізуе жыццё, забаранялася дакранацца да белай сярэдзіны.

На надмагільныя крыжы падвязвалі адпаведныя белыя ручнікі.

Таксама на развітанне нябожчыка з вёскай яго родныя вешалі ручнікі на праваднҹя крыжы.

Такім чынам, усе важныя этапы ў жыцці чалавека суправаджаліся выкарыстаннем ручніка, аздобленага вышыўкай, значэнне якой мела як сімвалічны, так і магічны сэнс. Я вельмі рада, што і ў дваццаць першым стагоддзі нельга ўявіць нараджэнне, хрышчэнне, вяселле, пахаванне і паўсядзённае жыццё без беларускага народнага ручніка.

Вельмі важнае месца ў спадчыне любога народа належыць яго мінуламу. Толькі ад нас залежыць захаванне і перадача наступным пакаленням усяго таго, што ў беларусаў важнае і адметнае. Да гэтага адносіцца і самаробны льняны ручнік, які аздабляўся на канцах прыгожай вышыўкай і карункамі.

Праходзяць гады, мяняюцца густы, на змену рукам чалавечым прыходзяць машыны, створаныя тымі ж рукамі… Але пакуль побач з чалавекам будзе жыць пачуццё прыгожага, імкненне да натуральнага, сапраўднага, то будзе жыць ручнік як сімвал вечнага.

Беларускі ручнік – верны спадарожнік беларусаў. Ручнік адлюстроўвае гісторыю народа, яго дух, здабытак культуры і мастацтва, творчыя памкненні і мастацкае светаўспрыманне. Загадкавымі знакамі арнаменту, магічнай абрадавай сілай і вобразнай мовай мастацтва вышыўкі і ткацтва ручнік прадаўжае прымаць удзел у нястомным дыялогу культуры мінуўшчыны і будучыні. Спадзяюся, што пад час экскурсіі вы адкрылі для сябе нешта новае і важнае. Дзякуй за ўвагу!